Аўтар: Ангеліна Пакачайла
26.02.2017 00:00

• **Упершыню ў гісторыі** ў базіліцы св. Пятра ў Ватыкане будзе адпраўлена англіканскае набажэнства – Вячэрняя малітва, падобная на каталіцкія Нешпары. Літургію адправяць 13 сакавіка пры алтары рымскай катэдры. Згоду на дадзеную падзею выразіў архіпрэзбітэр базілікі кардынал Анджэла Камастры. Набажэнства будзе часткай святкавання 50-годдзя Англіканскага цэнтра ў Вечным Горадзе.
†

• **Папа Францішак** перадаў 200 тыс. еўра на патрэбы педыятрычнай клінікі ў Бангі (Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка), якую наведваў восенню 2015 года ў рамках апостальскага падарожа на Афрыканскі кантынент. Грашовыя сродкі былі сабраны ад продажу дыскаў з дакументальным фільмам “Адкрываючы Ватыканскія музеі”, знятага Ватыканскім тэлевізійным цэнтрам. DVD-дыскі ва ўнікальным футляры выстаўляліся на аўкцыёнах у Лондане, Турыне, Мілане і Рыме. Дарэчы, гэта ўжо не першая дабрачынная ініцыятыва на карысць медыцынскай установы ў Бангі.

• **Ва ўсходняй Ісландыі** будуецца новая каталіцкая святыня, якую ўзводзяць славацкія капуцыны. Яна будзе выканана поўнасцю з дрэва, што паходзіць з радзімы гэтых манахаў. Разам з тым збіраюцца сродкі, неабходныя для пабудовы яшчэ аднаго касцёла ў паўднёвай частцы вострава. Неабходнасць узвядзення новых святынь вынікае з факту, што на працягу апошніх 10-ці гадоў колькасць католікаў у гэтай скандынаўскай краіне ўзрасла ў 3 разы. На дадзены момант іх у Ісландыі каля 14-ці тыс. і яны маюць там 6 парафій. Католікі складаюць 3,5% ад агульнай колькасці насельніцтва. У апошнія гады гэтая лічба павялічваецца.

• **Метрапалітэн у Мадрыдзе** (Іспанія) перадаў арганізацыі “Mensajeros de la Paz” (“Пасланцы Міру”) 5 тыс. білетаў для патрабуючых. Іх уручэнне адбылося ў касцёле св. Антонія, якім ужо 2 гады апекуюцца “пасланцы”. За гэты час святыня стала кропкай апоры для бяздомных, імігрантаў і жабракоў. “Мы вельмі ўдзячныя за гэтыя білеты, – гаворыць а. Анхель Гарсія, заснавальнік і кіраўнік «Mensajeros de la Paz». – Яны як чыстае золата для патрабуючых. Многія, хто не мае ніякага забеспячэння, павінны пераадольваць шмат кіламетраў, каб шукаць ежу ці вырашаць іншыя справы”.

• **На французскім кніжным рынку** з’явілася новая катэгорыя бестсэлераў – аўтабіяграфічныя апісанні вялікіх навяртанняў. На гэта звяртае ўвагу парыжская газета “La Croix”. Выданне акрэслівае некалькі агульных рыс такой літаратуры: асабісты крызіс

аўтараў, пошук сэнсу жыцця або барацьбу з сумневамі. Прыняцце веры прыводзіць да поўнага адраджэння і перамены. На думку чытачоў, сведчанні “блудлівых сыноў” падбадзёрваюць, паказваючы сутнасць каталіцкай веры, тое, што ў ёй больш за ўсё прыцягвае.

credo-ua.org; pch24.pl; ekai.pl